УДК 811.161.3’38

**А.М. Пісарэнка**

# Лінгвастылістычны аналіз сродкаў стварэння слоўнай экспрэсіі ў кантэксце сучаснай паэзіі

Вядома, што ў мове мастацкага стылю ўвогуле і паэтычнага падстылю ў прыватнасці рэалізуюцца ў большай ці меншай ступені ўсе камунікатыўныя якасці маўлення – правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць і інш. Гэта значыць, што мова мастацкай літаратуры павінна быць узорнай, яркай; і хаця яна часам выходзіць за межы літаратурнай мовы (бо тут могуць выкарыстоўвацца, напрыклад, і дыялектызмы, і жарганізмы, і прастамоўі), аднак тым не менш уяўляе сабой сістэму, у якой усё падпарадкоўваецца эстэтычнай функцыі мовы (сутнасць гэтай функцыі ў тым, каб праз вобразныя сродкі адлюстраваць свет, праз мову і вобразы паўплываць на эмоцыі/пачуцці чытача).

Мове паэзіі ўласціва больш эмацыйнае адлюстраванне рэчаіснасці, нечаканыя і складаныя асацыяцыі, таму ў ёй найбольш функцыянуе індывідуальна-аўтарскіх вобразных сродкаў, аказіянальных слоў. Можна сказаць, што мова паэзіі больш умоўная, таму пры лінгвістычным аналізе вершаваных твораў асаблівая ўвага павінна надавацца кожнаму слову, нават гуку (агульнавядома, што вобразы ствараюцца і на фанетычным узроўні з дапамогай алітэрацыі, асанансу і інш.), кожнаму тропу, радку, страфе, яе моўна-сэнсаваму напаўненню.

Мэта артыкула – прааналізаваць культурамоўны ўзровень сучаснай паэзіі, бо, як вядома, мова мастацкіх твораў выхоўвае эстэтычны густ, моўнае чуццё, а гэта не можа не ўплываць на фарміраванне светапогляду асобы.

Фанетычны ўзровень паэтычнай мовы дэманструе гукавыя асацыяцыі аўтараў, адлюстраваныя праз алітэрацыю і асананс, гукавобразы, складападзел, даўжыню радка, анаматапею і г.д.: *Ме**д**зь па азёрах **с**плыве, **С**ум у небе імгліс**т**ым… Як пе**с**ня, **з** галін **з**лятае Лі**с**це, лі**с**це, **З**алаці**с**тае лі**с**це, **С**то лі**с**ця**ў**, **Дз**е**с**яць лі**с**ця**ў**, Лі**с**т* (У. Караткевіч); *Даносіцца з нетраў туманных Праз даўкую чорную быль Тужліва-адчайнае: «**Га-а-н-н-о-о**…», Пяшчотна-жывое: «**Ва-сі-і-ль**…»* (С. Законнікаў); ***Ш**тохвіліны ля **ш**а**ш**ы **Ш**умна, як на кірма**ш**ы. **Ш**оргат, **Ш**орах, **Ш**ум пту**ш**ыны. За ма**ш**ынаю ма**ш**ына* (Р. Барадулін); *Адна **свечка** – адзін **чала**век, **ш**мат **свечак** – **веча**, і ўсе тыя людзі, **якіх** **засланіла** ад **све**ту **века** труны, **уцеляс**няю**цца** ў **свечках**, запаленых у імя і**х**няй памяці, і нана**ва** пра**жы**ва**юць** **ск**арочаны **курс** **жыцця*** (А. Разанаў); *Калі працягла заракоча, **Гугухне** голас угары, І шыба ў вокнах забразгоча і гоман пойдзе па бары* (Я. Колас).

Як відаць, паэтычны гукапіс валодае надзвычайнай выразнасцю, паколькі асобнымі гукамі, іх паўторам аздабляе лексічныя сродкі вобразнасці мовы (метафары, эпітэты, параўнанні і інш.). Названыя і іншыя тропы надаюць паэтычным радкам так званую вобразную дакладнасць. Асаблівую цікавасць тут уяўляе аўтарская іх разнавіднасць: *Ды мы наіўна прывыкаем, Што нам спатрэбіцца пасля **Прашытая баравікамі**, **Смалой прапахлая** зямля* (Г. Бураўкін); ***Веццем-прыгаршчамі клёны Дажджавыя кроплі ловяць*** (Я. Сіпакоў); ***Жоўты рай, дрымотны рай акацый Паланіла рупная пчала*** (А. Вялюгін); *Я люблю часіну навальніцы, **Калі б’е пярун па ўсіх ладах** / **І***



Репозиторий ВГУ

***злуюцца*** *ў хмарах* ***бліскавіцы, Кроплі асыпаючы на дах*** (П. Панчанка); *У блакіце* ***жаўрук*** *і* ***трымціць ён*** *там гузічкам* (Ю. Свірка); *Як у бары, бы* ***маленькія вожыкі****, Шышкі хваёвыя ўсыпалі дол, – Тры гады я не бачыў* (Р. Барадулін); *І* ***плачам бабрамі*** *нярэдка, Ля рэчкі суцішваем крок...* ***Не рэчка мялее, не рэчка****, А* ***лепшых пачуццяў*** *выток (Ю. Свірка); Рупліва іх [пакошаныя травы. – А.П.] мы ў копы зносім, і там, дзе Нёмна берагі,* ***У залатую нашу восень Ржавеюць пад дажджом стагі*** (М. Танк).

Прыведзеныя прыклады яшчэ раз дэманструюць незвычайнае аўтарскае бачанне рэчаіснасці. Індывідуальныя, непаўторныя асацыяцыі паэтаў дапамагаюць чытачу ўбачыць прыгажосць свету, яго гармонію праз вобразныя сродкі мовы.

На граматычным узроўні паэтычнага радка асаблівай выразнасцю валодае экспрэсіўны сінтаксіс – анафара, эпіфара, паралелізм, кампазіцыйны стык, градацыя, рытарычнае пытанне і інш.: ***А мне хочацца глядзець проста, а мне хочацца разумець проста і проста жыць – і бачыць светлае светлым, і бачыць цёмнае цёмным, крывое крывым…*** (А. Разанаў); ***Мы****, няўдалыя лапы, робім складаныя рухі;* ***Мы****, чалавечыя крылы, – звычайныя дужыя рукі;* ***Мы – нядаўнія лапы*** (Я. Сіпакоў); *Ты [мова] – наш сцяг, што нікому, нікому на свеце, нікому* ***Не дамо абсмяяць, апаганіць, забыць*** *ці* ***мячом зваяваць*** (У. Караткевіч); ***Жоўты антон****, Наліўны, сакаўны, На галінцы бязлістай вісіць. Сонца ў шэрым восеньскім садзе –* ***Жоўты антон*** (А. Багамолава).

Паэтычны сінтаксіс арганізуе радок: дапамагае вылучаць сэнсава важныя словы, фарміруе лагічнасць думкі, а таксама можа адыгрываць кампазіцыйную ролю.

Нягледзячы на ўмоўнасць вершаванай мовы, паэтычны радок павінен быць па-мастацку дакладным, лагічным: час, факты, падзеі, пра якія гаворыцца ў творах, не павінны супрацьпастаўляцца рэчаіснасці, пярэчыць адно аднаму. Так, як, напрыклад, можна назіраць у наступных радках: *Пагляджу ў твае сумныя вочы. Чым развеяць нямую тугу?* ***Я зраблю для цябе ўсё, што хочаш, А шчаслівай зрабіць – не змагу****. Не таму, што я бедны, як вецер. І характар мой тут ні пры чым.* ***А таму, што на ўсім белым свеце не бывае шчаслівых жанчын****.* Прачытаўшы гэтыя радкі, хочацца папытацца ў аўтара: дзе ён браў статыстычныя дадзеныя, апытваў якіх жанчын (шчаслівыя яны ці не), а яшчэ ўдакладніць ад імя жанчын: калі мужчына робіць для жанчыны ўсё, што яна захоча, г. зн., што ён сапраўды робіць яе шчаслівай?

Нелагічным, недакладным уяўляецца нам змест наступных радкоў: *У мяне быў* ***дзед Васіль****. І* ***дзед Іван****. Была* ***бабка Агата і Ганна, Але яны былі маўклівыя****. Быў прадзед Марцін* ***І прадзед*** *...* ***Як яго? Я нават імя яго не знаю. Не сказаў, як звалі. Быў нямы****; Ішла жанчына і курыла. Рыпеў пад ботамі сняжок. Сабе ўсё нешта гаварыла* ***І сплёўвала дымок набок****; Хацеў бы Шар зямны Абняць, Ды рукі кароткія. Хіба пасля смерці ўжо – Расцягну Атамы У Бясконцасць Рук.* ***Людзі – як балячкі! Але што ім Ласка тых Атамаў?; Вы спытаеце, Колькі мне год? Адкажу – Мне хочацца шчасця****; Я не твая ўжо. Я з другім, бо ты, Нарцыс,* ***стаў сябелюбцам, хоць быў калісьці дарагім****, але часам тым не вярнуцца;* ***Пад кожны ўдар Ты свой падставіш боль, замест яго Ты прымеш і атруту, знявагу і варожую любоў, бо нарадзіла Сына для пакутаў****; І яшчэ шмат чаго Маю я для таго,* ***Каб не быць чужаніцай І быць ёй не стаміцца; Я ведаю, чаму жанчыны Не бываюць такімі геніяльнымі, Як мужчыны: Муза жанчыны старэе разам З ёй, А муза мужчыны заўжды маладая і прыгожая.***

Як відаць з прыведзеных радкоў, дакладнасць і лагічнасць якіх часам бракуе творам, узнікаюць у выніку неапраўданага ўжывання злучнікаў але, хоць – у такім выпадку змест радкоў супрацьпастаўляецца і тады, калі ў гэтым няма неабходнасці; па-другое, праз штучную валентнасць слоў – *дымок сплёўваць*;



Репозиторий ВГУ

па-трэцяе, праз увядзенне «лішніх» радкоў, якія не маюць інфармацыі, а толькі запаўняюць вершаваную прастору – *людзі як балячкі* (сэнсава лішні радок). Бывае, што аўтары, магчыма праз малы жыццёвы вопыт, прыходзяць да высноў-алагізмаў, як у апошнім прыкладзе пра старэнне мужчынскай і жаночай музы або ў наступных вершаваных радках: *І ў шчасці часам точыцца туга,* ***І ў горы знойдуцца святло і асалода****; Чаму: у адных – шчасце без цяжкасцей, а да другіх –* ***злыбеды лашчацца****?* Магчыма, у шчасці можа быць туга, а вось наконт святла і асалоды ў горы – гэта думка, на наш погляд, спрэчная, як і злыбеды лашчацца – хутчэй злыбеды абрушваюцца.

Часам недакладнасць сэнсавага словаўжывання, няправільнага вызначэння месца слова ў паэтычным радку прыводзіць да такога віду стылістычнай памылкі, як двухсэнсоўнасць, у выніку якой «ажывае» першаснае значэнне слова, цьмяна выкладаецца думка. У сувязі з гэтым чытач можа неадэкватна ўспрыняць не толькі «расплывісты» радок, але і ўвесь тэкст: ***Яе мукі на ўсе рукі; Даль*** *апанована белай* ***завесай****,* ***Кружыць над полем, кружыць над лесам****; Бяжыць [алень] па палях, па лясах –* ***Аж пырскаюць знічкі ў вачах****... К аленісе цёплай бяжыць З надзеяй адзінаю – быць!; Так, пошукі кахання прывялі Да* ***страты неабачлівай крыві****; І чорны смутак сэрца дажджом пральецца золкім****, ды сонца абаўецца вакол вачэй вясёлкай; Балюча мне было раджаць... А ў небе сонца так іграла! Стагнала цела, а душа спакойна з боку назірала****; Шампанскае кавай прагнала.* ***Натхненне*** *адкуль узялося? Настолькі з* ***бяссоннем*** *зжылося –* ***да ранку амаль даканала****; ... калі жаль сэрца скалане і ў жылах* ***пульс заб'е вавёркай****; Холадна ценям на змерзлым снезе.* ***Цені – таксама дрэвы. Таксама і я, і ты****; Цурчыць ручэй паміж алешын. Бушуе бурная рака.* ***Хто дзіўных песень наразвешваў? Узлёт былога жаўрука****.*

Думкі і пачуцці паэтаў павінны быць зразумелыя кожнаму чытачу, бо, як пісаў П. Глебка, «пісьменнік не можа стаяць пры кожным чытачу і тлумачыць яму, калі той не зразумеў, сваіх думак, дапамагаючы пры гэтым, як у гутарцы, інтанацыяй і жэстам... Пісьменнік павінен выражаць сваю думку і перадаваць свае пачуцці з усімі іхнімі самымі тонкімі адценнямі так дакладна і проста, каб не патрэбна было ніякіх тлумачэнняў» [1].

З другога боку, празмерная дакладнасць, «называнне рэчаў сваімі імёнамі» таксама можа стаць небяспечнай для эмацыйнай, нагадаем – часам умоўнай мовы паэтычнага радка, якую нельга разумець літаральна: *Я буду ў лятунках цябе абдымаць, што б зоркі для нас не прызначылі,* ***тваё прамяністае сэрца трымаць сваімі халоднымі пальцамі; Я сэрца кірнула на лёд – яно і там палала жарсцю****. У сне іду на эшафот –* ***і галаву сякуць напасці****;... і ўжо не такое мне блізкае [****вершаня****], як тады, калі насіла цябе пад сваім сэрцам,* ***карміла малаком са сваіх грудзей****, люляла, песціла, гадавала...;* ***ты захлынешся ў ёй, чорнай крыві сваёй****; Хай сто дарог наканавана, але дамоў заўжды вярнуся,* ***бо я да роднай Беларусі пупавінай прывязана****.*

У выніку атрымліваюцца вершы, якія нагадваюць навукова-папулярныя анатамічныя нататкі: ***І адначасова ўсё ў ім думае – Губы****, якімі ён прыкурвае цыгарэту,* ***Вочы****, якімі глядзіць на агеньчык,* ***Лоб у вертыкальных складках****, Нават пальцы рук,* ***Асабліва тыя, што трымаюць полымя запалкі, Не пальцы – костачкі, Абгорнутыя ў пергамент.*** Трэба думаць, што слова пергамент у аўтара ў кантэксце прыведзеных радкоў набывае значэнне 'скура чалавека'. Застаецца высветліць, хто, што і чым будзе пісаць на такім пергаменце. Такім чынам, залішняя дакладнасць, як і залішняя вобразнасць, расплывістасць вершаванага радка не даюць поўнага ўяўлення чытачу пра

Репозиторий ВГУ

тыя вобразы, якія стварыў/хацеў стварыць паэт, выклікаюць такія асацыяцыі, эмоцыі, якія пярэчаць яго задуме.

Тропы ў мастацкім кантэксце, як адзначалася, павінны быць яркімі, экспрэсіўнымі: створаныя ў выніку індывідуальнага ўспрымання рэчаіснасці, яны выяўляюць не толькі арыгінальнасць аўтарскага мыслення, але і культуру маўлення. Менавіта тропы вядуць чытачоў у непаўторны свет мастацкіх вобразаў рознай сэнсава-эмацыйнай напоўненасці. Аднак апошнім часам назіраецца тэндэнцыя зніжэння эстэтычнай вартасці тропаў, магчыма, як вынік пошукаў дакладнай рыфмы і г.д. Тады атрымліваюцца сумна-вясёлыя малюнкі, бо ўзнікаюць не вобразы – антывобразы; уявіце сабе, як чалавек купаецца з асалодай, а цяпер прачытайце, як пра гэта піша паэт: ***Расцірае ікры крэпкімі рукамі, Прагна грудзі валасатыя скрабе – Ажно чырвань падае шматкамі, Ажно радасць гулка ў скроні б'е***. Такіх прыкладаў можна прывесці шмат*: **Імжакай сутоніцца вуліца. Стаіць каля плота, сутуліцца; Тонуць позіркі радасці ў зрэнках; Гэты год будзе даўкім, як костка ў слюне**... Як жывеш без мяне?;* ***Ракавінкамі катушак, бы ўгнаеннем, усыпаны на асушаным балоце чорныя агароды; Гнёзды варон, бы каўтуны ў валасах, вісяць у дрэвах; Гнілыя зубы лесу – ландышы ў час адцвітання;*** *Мной кіравала тады* ***помста – як дзень, сляпая; Забітае сонца ўпала*** *Далёка за край зямлі,* ***І кроў на спіну сцякала Аблокам, што там плылі; І сонца, як вугельчык цыгарэты, Нягадана праклюнула*** *над светам;* ***Паабсякалі гладка пальцы, Паперарэзвалі на часці***... *У карагодзе на палянцы Другія... Выглядаюць шчасце;* ***Дзядзька, як бусел з пратэзам, куляй падбіты, Сушыць на сонцы пратэз; Гулі, як вены, правады***.

Як відаць з прыведзеных прыкладаў, слова не даруе неахайнага, няўважлівага стаўлення да сябе: у такім выпадку яно замест таго, каб маляваць яркі запамінальны вобраз, стварае штучныя, прымітыўныя, двухсэнсоўныя вобразы. Думаецца, гэтая з'ява – таксама вынік ненатуральнасці сувязі паміж вобразам і тым прадметам, з якім ён атаясамліваецца.

Бывае, што і самі тэмы, як і вобразы, якія выступаюць у якасці аб'ектаў паэтычнага асэнсавання, нязначныя, штучныя. А калі нават і тэма значная, то асабліва ў маладых аўтараў, мусіць, недастатковы лексічны запас, каб яе апісаць, «расквеціць» словам, ці «заземленыя» асацыяцыі, якія «прыніжаюць» паэтычныя памкненні-«ўзлёты» творцаў: *Не спалася. Ложак быў шырокі і мулкі.* ***Шукаў вачамі сучкоў у столі****; Людзі прыходзяць у парк падыхаць чыстым паветрам,* ***А сосны, праз адну, кадзяць над імі ўласнымі трупамі; Без нагі [голуб], а есці хочацца. Без нагі не без крыла!****; Прачнулася ноччу ад дотыку твайго нецярплівага* ***цела. Пад месяца хворымі промнямі Яно мармурова бялела і гойсала ў жудасным танцы ўгары, нібы здань над магілай...; Я б хацела памерці ў сне, Каб сабачка мой сніўся мне... І не ўцяміла б я тады, Што наяве мне ўжо кранты****; І сталіся словы яго Запаветам. І я паўтару іх, і ты.* ***Спаўняюцца ўсе абяцанкі на свеце. Калі не на гэтым, то значыць – на тым; Скрыжаванне. Неба. Сонца дзіўны бубен. Снег, як цукар. І сабакі з клопатам пра род. Фырканyў аўтобус. Ты!.. Стаю разгублен. Далі. Поле. Лес. І рэчкі сіні брод.***

На жаль, такія рыфмаваныя наборы слоў ці фраз, пазбаўленыя не толькі эстэтычнай вартасці, але і ўвогуле сэнсу, дэманструюць не самыя лепшыя якасці сучасных беларускіх паэтычных твораў. Думаецца, у бязглуздзіцы няма «апраўдання рыфмай». Хочацца папытацца ў аўтара, што ён хацеў сказаць наступнымі радкамі: ***Стаю і пацею І слова сказаць Не смею***. *Бо сонца свеціць. Бо мячык ганяюць Дзеці.* ***І муха аб шыбу б'ецца*** *– Аж хата трасецца* або *Сусед мой дом пабудаваў На скрыжаванні праўдаў і няпраўдаў,*



Репозиторий БГУ

***Над домам вісне сінява**, Ля дома сад, і смех, і радасць... Шпакі свіргочуць на антэне, пад яблыняй у садзе стол...* ***Стаю ля плота ў знемажэнні, Зайздрошчу ціха з-за кустоў**.* Калі чытач з багатым уяўленнем падключыць сваю фантазію, то наўрад ці «намалюе» вобраз, напоўнены глыбокім сэнсам, поўны эстэтычнай вартасці: што ж такое павінны былі рабіць за сталом суседзі, каб аўтар/лірычны герой знемагаў ад ціхай зайздрасці ды яшчэ ля плота, з-за кустоў падглядаючы.

Вядома, што мове паэтычных твораў уласціва такая з'ява, як версіфікацыйныя адхіленні (адхіленні ад моўных нормаў – акцэнталагічных, граматычных), выкліканыя рытмам або рыфмай верша. Самым бяскрыўдным такім адхіленнем з'яўляецца выкарыстанне *у* нескладовага замест складовага ці наадварот. Іншыя ж адхіленні адлюстроўваюць моўныя з'явы, не прадуктыўныя ў беларускай літаратурнай мове, не ўласцівыя ёй, якія не дэманструюць адметнасць яе ладу: *Між лясного роднага карэння, Між* ***асеўшых*** *шэрых валуноў...; Ледзь не кожны лісточак Быў* ***распраўлен*** *яго даланёю,* ***пакратан*** *яго дрыготкімі рукамі; Ці ствару я Жыцця Свайго Песню? Траплю ў Кнігу Жывых ці* ***Памершых*** (памерлых. – А.П.); *Прыйшла зіма – Ні снегу, ні* ***марóзаў*** (маразоў. – А.П.); *За памяць доўгую пра іх мы* ***п'ем*** (абвесны лад; п'ём. – А.П.) *віно; І вецер стукае ў* ***спіну́*** (спіну. – А.П.)*: Глядзі, а бездань побач. Ну?!; Там баравіннае паветра, Там* ***даражэйшы*** (трэба ўжываць элятыў, форма найдаражэйшы – самы дарагі. – А.П.) *успамін* (недзе ёсць таннейшы? – А.П.).

Думаецца, нельга блытаць з версіфікацыйнымі адхіленнямі сучаснай паэтычнай мовы тыя моўныя факты ў творах пісьменнікаў ранейшага пакалення, якія звязаны з не ўсталяванымі яшчэ ў той час моўнымі нормамі: Пала раса; у пал**ёх** Загарэліся пацеркі мілых Жоўта-чырвоных агнёў… (М. Багдановіч); Зоры гавораць па-над возерам вольным, Човен цалуе спакойную сінь, Плаўна калышацца ўзмахам павольным, Будзіць нямую, застыўшую плынь (П. Трус); Паважайце тую птушку, Што крыўды не роб**е**; Не цурайце**сь** роднай песні Ў шчасці і ў жалобе (Я. Купала); А елкі хмурымі крыжамі Высока ў небе выдзялялі**сь**, Таемна з хвоямі шапталі**сь** (Я. Колас).

Відавочна, што выдзеленыя моўныя факты не ўласцівыя сучаснай беларускай літаратурнай мове, таму іх можна кваліфікаваць як **версіфікацыйныя адхіленні часу**.

Тыя ж нязначныя моўныя хібы, якія таксама не адпавядаюць сучасным моўным нормам, выкліканыя рытмам і рыфмай вершаванага радка, не скажаюць змест твора, не «зацямняюць» вобразаў, патрабуюць адпаведных каментарыяў лінгвіста ў адпаведнай сітуацыі: ***А ільнам, бы нам, няўседкі** – Ліўнем мыюцца з ахвотай;* ***А а**пенек – ля пнёў і ля сховішч вавёрак…; Ты бачыш адноўлены горад? А* ***да́лей**, дзе неба блакіт, Шырокае Мінскае мора…; Мяне кліча ў госці друг мой лепшы – Шэры дрозд,* ***цудоўнейшы*** *спявак; Зямлі не адагрэць Агнём* ***лістве*** *апошняй*. Як вядома, прыстаўныя галосныя ўзнікаюць, калі ў моўнай плыні папярэдняе слова заканчваецца на зычны; паўтор аднолькавых галосных і зычных на стыку слоў парушае мілагучнасць маўлення; дыялектны націск, які істотна не ўплывае на мелодыку верша, на гучанне слова, можна разглядаць як магчымы ў літаратурнай мове маўленчы варыянт; элятыў, які называе ў дадзеным выпадку гранічна высокую ступень якасці без супастаўлення з якасцю іншых прадметаў, у літаратурнай мове выражаецца простай або складанай формай найвышэйшай ступені параўнання; літаратурная форма множнага ліку назоўніка *ліст – лісты*, а значэнне зборнасці перадаецца назоўнікам *лістота*.

Рускі даследчык мовы мастацкага стылю В.У. Вінаградаў слушна зазначае, што «мова мастацкай літаратуры... мае законнае права на дэфармацыю, на



Репозиторий ВГУ

парушэнне агульналітаратурных нормаў» [2–3]. Аднак нельга забывацца на тое, што ўсе адхіленні ад літаратурных нормаў павінны быць эстэтычна матываванымі (напрыклад, дапушчальныя яны ў маўленні персанажаў, дзе ёсць устаноўка на імітацыю размоўнага стылю).

Нечаканы эфект, як правіла, узнікае ад такой памылкі, як змяшэнне стыляў, калі словы з «палярнай» стылістычнай афарбоўкай уводзяцца ў адзін мікракантэкст, вытлумачваюць пры гэтым адно паняцце не з супрацьлеглых бакоў: *Я – **трапяткая** адчайная знічка, якая **марыць стаць Галактыкай**, але ўсе **высілкі марныя**; На шлях **Немезіды Вечнасць стала**. **Свіннёю ружоваю зарохкаў новы дзень**; Як дасягае [чалавек] ёй [**лапатай**] патрэбнае мяжы, **Дзе болей апушчэнне немагчыма**; Мне – **катарсісам** Вашы абдымкі ў **каламуці шалёных** хваляў; Ты – **як надзея, Апора, цвердзь**. Дзень маладзее, **Начхаць** на смерць; І жыве чалавек у **вакууме**, Бо **будучага няма яшчэ**, А **былога ўжо няма**. **Прырода, як вядома, не церпіць пустаты**. Вось яна і **заткнула гэтую шчыліну** Чалавекам.*

Бясспрэчна, што рэжуць вока і слых высілкі знічкі і тыя ў вечнасці дні, якія рохкаюць свіннямі, ці катарсіс, які разбаўляе каламуць і г.д. Змяшэнне стыляў – у дадзеным выпадку спалучэнне слоў з кніжнай, высокай афарбоўкай са словамі размоўна-афарбаванымі – вядзе да зігзагападобнага выкладу думкі, такога ж апісання аўтарскай эмоцыі, што ўрэшце парушае агульную танальнасць твораў, разбурае семантыка-стылістычнае адзінства радкоў, вобразаў і тым самым выклікае супярэчлівыя адносіны ў чытача.

Відавочна таксама, што словы размоўнага характару кантрастуюць з філасофскім зместам і, наадварот, кніжныя словы «выбіваюцца» з нейтральнага кантэксту: *Боль жыццю не перашкода! У чалавека **пэнкае** галава, а ён думае; ...дзе **квецень каштанаў** прылашчыць **свяжак**; Ты помніш **сарамлівасць хваляў** – **электраімпульсы** між намі; Да сноў **уладкавалася** прырода, Спакойных доўгіх сноў.*

У кантэксце такога стылістычнага недагляду, як змяшэнне стыляў, хочацца звярнуць увагу на функцыянаванне слоў іншамоўнага паходжання ў паэтычным радку. У.В. Анічэнка, аналізуючы мову навуковых тэкстаў, правамерна сцвярджае, што «ў многіх выпадках запазычанні ўскладняюць успрыняцце, зацямняюць сэнс інфармацыі» [4]. Што тады казаць пра мову паэзіі, саму паэзію, якая павінна быць па меншай меры «песняй», а не формулай ці тэарэмай з доказам і вывадам: *Ды **памяць** – **мой банк інфармацыі** – мне **выдала тэкст** на дысплеі; Баюся спаць, твой дух чакаю **апакаліпсістычнымі** начамі; Няўжо так моцна награшыла душа падчас **рэінкарнацый**; **Фантазіяй з хвастом метэарыта** імчыцца думка; Мне – **катарсісам** Вашы **абдымкі** ў каламуці шалёных хваляў; **Міраж трансфармуецца ў рэчаіснасць**.*

Адзначым, што прыклады няўдалых радкоў узяты з твораў сучасных паэтаў І. Чыгрына, Н. Капы, В. Аколавай, Т. Барысюк і інш.

Як відаць, сучасны вершаваны радок часам «хварэе» на недасканаласць. Пазбаўлены выразнасці, лагічнасці, вобразнай дакладнасці, ён становіцца як бы апаэтычным, бо выклікае ў чытачоў супярэчлівыя эмоцыі, можа нават супрацьлеглыя аўтарскім пачуццям, дэманструе не яркія запамінальныя вобразы, а поўныя схематызму антывобразы (прыгадайце хаця б перыфразу *гнілыя зубы лесу – ландышы ў час адцвітання*).

У ідэале павінна быць усё інакш, бо паэтычная функцыя мовы абапіраецца на камунікатыўную, зыходзіць з яе, але ўзводзіць над ёй падпарадкаваны эстэтычным заканамернасцям мастацтва новы свет маўленчых сэнсаў і суадносін [3, с. 147].

Репозиторий ВГУ

## *Л І Т А Р А Т У Р А*


1. ***Глебка, П.*** Збор твораў: у 4 т. / П. Глебка. – Т. 4. – С. 14.
2. ***Виноградов, В.В.*** Литературный язык и язык художественной литературы / В.В. Виноградов // Вопросы языкознания. – 1955. – № 4.
3. ***Виноградов В.В.*** Проблема русской стилистики / В.В. Виноградов. – М., 1981.
4. ***Анічэнка, У.В.*** Асновы культуры маўлення і стылістыкі / У.В. Анічэнка. – Мінск, 1992. – С. 185.



## *S U M M A R Y*

*The problems of culture in the language of poetry are discussed in this article. The language mistakes, reducing aesthetic value of poetry, are being analyzed there.*



*Поступила в редакцию 2.04.2008*



Репозиторий ВГУ